Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# План-сцэнарый выхаваўчага мерапрыемства “Падарожжа ў свет кнігі”, прысвечанага Сусветнаму дню кнігі і абароны аўтарскіх правоў (23 красавіка).

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск

2018

# ЗМЕСТ

1. Уступнае слова.

2. Інфармацыйнае паведамленне “Як з’явілася першая кніга”.

3. Віктарына.

4. Вусныя паведамленні студэнтаў.

5. Вершы пра Ф.Скарыну, пра кнігі.

6. Гутарка са студэнтамі.

7. Заключнае слова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Уступнае слова.

## 2. Інфармацыйнае паведамленне “Як з’явілася першая кніга”.

Гісторыя кнігі цесна звязана з развіццём пісьменнасці. У старажытнасці кніг не было, таму што людзі не ўмелі яшчэ іх рабіць. Але неабходнасць запісваць, перадаваць іншым нейкія звесткі, вопыт, веды ўзнікла ў людзей вельмі даўно. Таму “старонкамі” старажытных кніг рабіліся камні, сцены пячор, скалы… Пісалі на ўсім.

З цягам часу старажытныя людзі дадумаліся пісаць на гліняных таблічках. Адбылося гэта пяць тысяч гадоў таму назад, у Месапатаміі. На гліняныя таблічкі завостранай палачкай наносіліся клінападобныя знакі. Пасля чаго таблічку абпальвалі ў агні і яна рабілася трывалай, а ў якасці пераплёту выкарыстоўвалася драўляная скрыня. Такая “кніга” магла ўключаць у сабе дзясяткі, а то і сотні гліняных таблічак. Вага гэтай кнігі была вельмі вялікая, і насіць яе з сабою было надта складанаі нязручна.

Старажытныя рымляне ў якасці матэрыялу для пісьма выкарыстоўвалі драўляныя прамавугольныя дошчачкі, на якія быў нанесены слой воску,-- *церы*. На такіх васковых дошчачках літары і лічбы выводзілі завостранай з аднаго канца палачкай; другі канец палачкі меў форму лапаткі – ім разраўноўвалі воск, сціраючы напісанае. Такая завостраная палачка для пісьма называлася *сціло́* (грэч. stylos).Церы ў Старажытным Рыме былі недарагім, а таму вельмі распаўсюджаным матэрыялам, але людзі працягвалі шукаць больш зручны матэрыял, з якога можна было б зрабіць кнігу.

І найшлі… У Афрыцы, па берагах рэк Старажытнага Егіпта, расла расліна, нечым падобная да нашага чароту. Называлася яна *папірус*. Людзі заўважылі, што валакно гэтай расліны пасля высыхання робіцца вузенькай стужачкай, якая вельмі добра ўпітвае фарбу. Таму лісты папірусу сталі склейваць у доўгія палоскі, робячы з іх світкі. Некаторыя світкі маглі дасягаць 100 метраў у даўжыню. Так з’явіліся папірусныя кнігі. Пісаць на іх было зручна, але з часам яны ўсё жтакі ламаліся і рассыпаліся.

Паступоваў розных краінах людзі навучыліся выкарыстоўваць самыя розныя матэрыялы для стварэння кніг. Так, у Пергаме, у Малой Азіі, пісалі на тонкай цялячай або авечай скуры (адсюль пергаметныя кнігі), у Індыі – на пальмавых лістах, а ў Кітаі – на бамбуку. Вынаходцам паперы традыцыйна лічыцца кітаец Цай Лунь. Гэта адбылося ў 105 г. н.э. Першыя лісты паперы былі зроблены з раслiннага валакна, але канкрэтна з валакна якіх раслін – ніхто не ведаў, бо гэта трымалася ў строгім сакрэце. Толькі ў X ст. н.э. у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Еўропе з'явілася папера, звараная з размолатых ануч, кары дрэў, бамбуковых шчэпак. Рабілі яе таксама з саломы, жыта, пшаніцы, аўса, крапівы, чароту… Паперу раблі ўручную, выкарыстоўваючы самую прымітыўную тэхніку. За дзень цяжкай працы можна было атрымаць толькі каля 100-120 кг. паперы. Для развіцця кнрігадрукавання гэтага было недастаткова, і таму вырашылі выкарыстоўваць драўніну. Вопыт удаўся. З таго часу паперу робяць менавіта з гэтага матэрыялу.

У Кіеўскай Русі доўгі час выкарыстоўваўся іншы матэрыял для пісьма – *бяроста* (кара бярозы з таго боку, які прылягае да дрэва). Знакі на бяросце наносіліся тонкай палачкай з вушкам уверсе – *піса́лам*. У гэтае вушка ўцягвалі вяровачку і насілі піса́ла на поясе. Першыя берасцяныя граматы знойдзены на тэрыторыі Ноўгарада, Полацка, Смаленска…

Пазней стваральнікамі (перапісчыкамі) кніг былі манахі. Гэта была вельмі цяжкая, складаная праца, таму кнігі каштавалі дорага і не мелі шырокай распаўсюджанасці.

У 15 ст. немец Іаган Гутэнберг упершыню зрабіў кнігадрукаваны станок. Ён стаў адліваць літары з металу. З асобных літар складаліся словы, радкі, старонкі. Такія металічныя літары можна было выкарыстоўваць доўгі час. Механізаваны станок Гутенберга паскорыў працэс друкавання кніг. Першая друкаваная кніга сышла з гэтага станка ў 1456 годзе. Хутка тыпаграфскія майстэрні з'явіліся ў розных гарадах Еўропы.

## 3. Віктарына.

1. Хто з'яўляецца першадрукаром сярод усходніх славян?

(Францыск Скрына)

2. Калі і дзе Ф.Скарына надрукаваў першую кнігу? Як яна называлася? (1517 г. у Празе, "Псалтыр")

3. Колькі кніг Бібліі надрукаваў Ф.Скарына?

(23нігі)

4. Хто надрукаваў першую кнігу у ВКЛ (на тэрыторыі сучаснай Беларусі)? У якім горадзе і як называлася кніга?

(1562 у Нясвіжы Сымон Будны надрукаваў "Катэхізіс")

5. Ці ёсць у Нясвіжы помнік Сымону Буднаму і дзе ён стаіць?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Помнік ёсць, стаіць на месцы, дзе ў старажытнасці была друкарня).

6. Як ушанавала памяць пра Ф. Скарыну ў нашым горадзе?

(Помнік каля Нацыянальнай бібліятэкі, вуліца Францыска Скарыны).

**4. Вусныя паведамленні студэнтаў.**

- Францыск Скарына – наш славуты зямляк.
- Друкарскія майстэрні ў ВКЛ.
- Першы беларускі буквар.
- Першыя беларускія граматыкі.

**5. Вершы пра Ф.Скарыну, пра кнігі.**

**6. Гутарка са студэнтамі.**

- Якую кнігу вы нядаўна прачыталі?
- Кнігі якога жанру вы любіце чытаць?
- Ці помніце вы сваю першую кнігу?
- Якую кнігу першай вы прачытаеце сваім дзецям?
- Назавіце вашы любімыя кнігі для дзяцей.
- Прачытайце на памяць вершы для дзяцей А.Барто, К.Чукоўскага, В.Віткі, Э.Агняцвет…
- Якую кнігу вы ўзялі б з сабою на бязлюдны востаў?
- Якую кнігу вы падарылі б свайму лепшаму сябру?
- Якой кнізе вы аддаеце перавагу -- папяровай ці электроннай?
- Як вы лічыце, папяровая кніга адыходзіць у нябыт?

**7. Заключнае слова.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ